# ЛЮБЛЮ ПРАЦАВАЦЬ

—Я Ж ЗУСІМ звычайны, — сціпла прызнаецца Грыша.

Добрая ўсмешка, разважлівасць, нейкая дзіўная ўпэўненасць і сціпласць прыгожа жывуць у ім, «зусім звычайным» старшыні прафбюро матфака Грышы Чэчкі. Адкуль гэта ў яго: з ленінградскага завода «Электрасіла», дзе брыгадзіраў пасля дэмабілізацыі, ці армейская звычка? Ды і ці так ужо гэта важна? Галоўнае тое, што бачаць і цэняць у ім гэтыя рысы людзі: выкладчыкі, сябры-аднакурснікі, члены прафбюро.

Усяго другі месяц «старшынства», а такая захопленасць працай, такое разуменне свайго абавязку перад матфакаўцамі, якому можна толькі шчыра пазайздросціць.

— Я люблю працаваць і буду лічыць за шчасце, калі траплю пасля заканчэння універсітэта на завод. Наогул жа, добра ведаю — матфак для мяне не мяжа, я буду вучыцца! Да 35 год, — гэта Грыша гаворыць ужо з праменьчыкамі гумару ў вачах,— яшчэ не адзін інстытут можна закончыць. Хацелася б у будучым прысвяціць сябе будаўнічай справе. Вось тут і спатрэбіцца мая любімая навука, на мой погляд, самая практычная, якой я цяпер займаюся, — дыферэнцыяльныя ўраўненні.

Сталасць і сур'ёзнасць —характэрнейшыя з рыс Грышы. На пасяджэнні прафбюро ён здаецца самым дарослым, хоць ёсць і старэйшыя хлопцы. Прапановы ў Чэчкі лаканічныя, пастаўленыя «на нагу канкрэтнасці».

Да яго слоў прыслухоўваюцца, яму давяраюць.

І Грыша цэніць гэтае давер'е. Стараецца апраўдаць яго. Ці не таму ўжо, як жартуе сам, «колькі пар лапцей стаптаў», пакуль абышоў усе неабходныя інстанцыі, каб «выбіць» музычныя інструменты для факультэцкага ансамбля. Цвёрда паабяцалі.

Справы інтэрната, студсавета—яго справы. Клопаты камітэта камсамола—клопаты Чэчкі. І тут няма таго падзелу, які досыць часта можна назіраць: гэта іх справа, а гэта — наша.

— Наша справа да ўсяго, што датычыцца студэнтаў: да іх вучобы, адпачынку, матэрыяльнага становішча, паводзін у інтэрнаце.

Сказанае падмацоўваецца і тым, што ўжо на другім курсе (а цяпер Грыша трэцякурснік) ён добра ведаў турботы прафкома, бо быў старшынёй жыллёва-бытавой камісіі.

...Клопаты, справы, якія займаюць столькі часу, не перашкаджаюць хлопцу добра рыхтавацца да заняткаў. Пакуль што матэматычная дакладнасць не падводзіць прафорга: часу хапае на ўсё.

Так, умее працаваць, умее вучыцца і вучыцца кіраваць. А адпачынак?

Ён у Грышы таксама цікавы. Нядаўна быў з сябрамі на Святым возеры, што на Магілёўшчыне. Захоплены гэтай паездкай.

— Там столькі легенд пра возера ходзіць, ды такіх страшных, што нават купацца было страшнавата ў ім. А прыгажосць якая! Асабліва ноччу, калі само возера, здаецца, з глыбінь сваіх выносіць гэтыя легенды.

Цікава чуць такое зусім «не матэматычнае» апісанне. Яшчэ больш нечакана даведацца, што Грыша любіць Блока.

Добры сябар у хлопца і фотаапарат.

— Фатаграфаваць у арміі навучыўся. Хочацца хлопцам здымкі дадому паслаць, там іх чакаюць родныя, дзяўчаты, а горад далёка. Вось я і заняўся фотасправай. Чаму б не зрабіць людзям прыемнае?

Зрабіць людзям прыемнае... Ці так ужо часта мы думаем пра тое, каб не сабе, а другім прынесці радасць? А іменна гэта і кіруе ўсімі імкненнямі Грышы Чэчкі.

Яго намеснік і сябар Міша Пікта кажа:

— Іменна пра такіх людзей расказваць трэба. Пабольш бы нам такіх хлопцаў, як Грыша.

А сапраўды. Пабольш бы. **Н. ПЯТРОЎСКАЯ.**



*Таццяна ЦЭХАНОВІЧ — трэцякурсніца аддзялення палітэканоміі. 40-годдзе гістарычнага факультэта яна сустракае выдатнай вучобай. «Зараду яе працаздольнасці і энтузіязму хапае не толькі ёй, але і нам», — так адзываюцца аб ёй сябры.*

*Фота А. ЦЫГУЛЁВА.*

НА ЖУРФАКУ

# ЦІКАВЫЯ СУСТРЭЧЫ

Студэнты I курса сустрэліся з загадчыкам аддзела вучнёўскай і студэнцкай моладзі рэспубліканскай газеты «Чырвоная змена» Клябанавым. Першакурснікам вельмі карысна было паслухаць аб нялёгкай працы журналіста. Для таго, каб стаць ім, трэба многа працаваць над сабой.

Клябанаў пазнаёміў рабят з задачамі, якія даводзіцца вырашаць і яго аддзелу, і яму асабіста. Цікава было даведацца аб журналісцкіх справах і наогул аб усіх тых праблемах, якія ставіць і вырашае на сваіх старонках «Чырвоная змена».

**Л. ВАРАНКО.**

* * *

Аб цяжкай і карпатлівай працы рэпарцёраў расказалі студэнтам супрацоўнікі аддзела навін шэрагу газет і БЕЛТА. Перад рабятамі выступілі старшыня секцыі рэпарцёраў М. М. Бутрымовіч, загадчык аддзела навін газеты «Советская Белоруссия» А. П. Літвін, загадчык аддзела навін «Вячэрняга Мінска» В. В. Някрасаў і іншыя.

**А. РУДНІЦКІ.**

* * *

З вялікай увагай і цікавасцю праслухалі студэнты лекцыю аб правільным успрыманні лекцыйнага матэрыялу, аб асновах паспяховай работы над першакрыніцамі, якую прачытаў на першым курсе выкладчык кафедры педагогікі В. Г. Вашчанка. Першакурснікі атрымалі веды, такія неабходныя для іх паспяховага навучання і для падрыхтоўкі да надыходзячай сесіі.

**В. БОРСУК.**

* * *

Л. І. Тулузін, выкладчык тэатральна-мастацкага інстытута, — дызайнер, або мастак-канструктар. З яго вуснаў журналісты пачулі цудоўны расказ пра дызайн і дызайнераў, задачы, што вырашаюцца імі, і перспектывы дызайна. Студэнтаў зацікавілі работы выпускнікоў тэатральна-мастацкага інстытута, слайды якіх прынёс з сабой Леў Іванавіч. Праекты вызначаліся арыгінальнасцю, зручнасцю.

**С. МІКАЛАЕВА.**



**Дзверы універсітэта гасцінна расчынены не толькі для студэнтаў. Гэтыя хлопчыкі і дзяўчынкі — сямікласнікі 23-й мінскай школы. Разам са сваёй настаўніцай Юліяй Андрэеўнай Белацаркоўскай яны прыйшлі на кафедру заалогіі. Кандыдат біялагічных навук Тэліна Іванаўна Запольская — іх экскурсавод.**

**Фота А. ЦЫГУЛЁВА.**

НА МАТФАКУ

# СУВЯЗІ ЎМАЦОЎВАЮЦЦА

Агітбрыгада матэматычнага факультэта выступіла перад навучэнцамі ГПТВ № 17 металістаў. Гэта было адно з першых мерапрыемстваў шэфскага сектара камітэта камсамола матфака ў новым навучальным годзе.

Сярод удзельнікаў агітбрыгады ёсць універсалы, якія ўмеюць і спяваць, і танцаваць, і дэкламаваць. Навучэнцы ГПТВ пачулі ў выкананні Уладзіміра Будкіна байку «Каралеўскі бутэрброд», убачылі яго выконваючым сцэнкі са студэнцкага жыцця.

У той жа праграме гучалі і «Хакейны рэпартаж» у выкананні Ігара Слуцкага, песні вакальнай групы агітбрыгады. Навучэнцы ГПТВ цёпла віталі самадзейных артыстаў, а потым пазнаёмілі іх са сваім вучылішчам, паказалі кабінеты, вучэбныя класы.

— Шэфскія сувязі з навучэнцамі ГПТВ № 117,—сказала Вера Чарняўская, якая ўзначальвае шэфскі сектар камітэта камсамола матфака, — безумоўна, будуць мацнець.

Запланавана сустрэча студэнтаў матфака і навучэнцаў па валейболу, афармленне кабінета матэматыкі ў вучылішчы, афармленне стэнда «Беларусь камсамольская».

**В. МІХАЙЛАВА.**

ЯК ЖЫВЕШ, ПЕРШАКУРСНІК! ЯК ЖЫВЕШ, ПЕРШАКУРСНІК!

# *БУДЗЕМ ВЕРНЫЯ...*

Колькі юнакоў і дзяўчат мараць насіць гордае імя студэнта адной са старэйшых ВНУ рэспублікі — БДУ. Прызнацца, я даўно зайздросціла тым, хто тут займаўся.

Лета гэтага года для мяне было асаблівым: у ліпені атрымала дыплом аб сканчэнні Мінскага педвучылішча, а ў жніўні — студэнцкі білет, які сведчыў, што я прынята ў вялікую сям'ю матфака. З першых дзён адчула кіпучае, бурнае жыццё ВНУ, па-новаму ацаніла свае сілы і магчымасці, рашыла: вытрымаю, я павінна вытрымаць.

Сваёй падрыхтаванасцю я абавязана выкладчыцы матэматыкі МПУ Алене Рыгораўне Рыбаковай. Гэта яна дапамагла зрабіць яшчэ адзін цвёрды крок у жыццё. Словы ўдзячнасці хочацца сказаць усім выкладчыкам вучылішча за тое, што я сёння — студэнтка універсітэта.

Якія ўражанні аб студэнцкім жыцці? Ва універсітэце мы адчулі больш адказнасці за ўсе свае ўчынкі і справы: за кожны крок адказваем самі, важныя пытанні абмяркоўваем разам, групай. Дарэчы, некалькі слоў аб ёй.

Група наша вельмі дружная, а пасябравалі мы ўдалечыні ад Мінска, на Віцебшчыне. Там пазналі адзін аднаго блізка. І мне здаецца, што знаёма я са сваімі аднакурснікамі ўжо даўным-даўно...

А зрэшты, нядаўна. Бо мы яшчэ ні разу не хваляваліся перад экзаменамі, не радаваліся поспеху і не засмучаліся з-за няўдач.

Я думаю, што калі мы адстаялі права насіць гордае імя студэнт, то будзем верныя яму. Наша мэта— з семестра ў семестр усім курсам толькі з добрымі і выдатнымі поспехамі.

**Т. СТРУК.**

# ХІМІЯ І ГЕАГРАФІЯ

— Я нават не думала, што на геафаку вывучаюць хімію.

Гэтыя словы я пачула ў калідоры, дзе ў чаканні сваіх першых лабараторных заняткаў па хіміі стаялі першакурснікі.

Сапраўды, хімія стаіць нароўні з асноўнымі прадметамі, якія выкладаюцца географам. Тэарэтычны матэрыял, набыты студэнтамі за два месяцы вучобы на лекцыях і семінарах, павінен замацавацца на практыцы.

...Хімічная лабараторыя застаўлена колбамі, рэтортамі, прабіркамі з рознакаляровымі растворамі, хімічнымі рэчывамі. Яна мае свой спецыфічны пах, і першакурсніку хочацца адразу ўсё разгледзець, памацаць, панюхаць. Але перад работай неабходна азнаёміцца з правіламі па тэхніцы бяспекі. Раіса Іванаўна Козляк, асістэнт, расказвае аб агульных правілах абыходжання з хімічнымі рэактывамі і злучэннямі.

— Сёння ў нас вялікая тэма: «Хуткасці хімічных рэакцый і хімічная раўнавага», — гаворыць Раіса Іванаўна.

Студэнты ўважліва слухаюць, запісваюць новыя формулы і ўраўненні рэакцый.

— А зараз замацуем матэрыял, — Раіса Іванаўна падыходзіць да журнала, — Калі ласка, Клышко, ідзіце да дошкі.

Заданне зусім простае: расставіць каэфіцыенты ва ураўненні злучэння алюмінію з хлорам. Дзяўчына ўпэўнена бярэ ў рукі мел і хутка абяўляе правільнае рашэнне.

Зноў задача. Цяпер ужо на хуткасць рэакцыі. Ля дошкі юнак доўга думае над умовай. Так і хочацца сябрам дапамагчы яму, падказаць. Але, нарэшце, ён сам знаходзіць правільны адказ.

Яшчэ задача...

У першакурснікаў зацікаўленыя твары. Заняткі праходзяць хутка. Але, як заўжды нечакана, гучыць званок... **І. САВЕТКІНА.**

# УСЁ Ў НАШЫХ РУКАХ

Для кожнага чалавека наступае час, калі ён павінен прыняць рашэнне, якое ў многім вызначае яго лёс, яго жыццёвы шлях. Мабыць, не будзе памылкай, калі я скажу, што нам, скончыўшым нядаўна школу, не зусім лёгка знайсці гэтае правільнае рашэнне. Мы жывём у імклівы век касмічных палётаў, ЭВМ і паўсядзённых адкрыццяў. Бывае, мы не прыкмячаем бегу часу ў кругавароце падзей, якія адбываюцца. Але як бы там ні было, скончыўшы школу ці тэхнікум, мы стараемся знайсці сваё месца, сваю дарогу.

Уступныя экзамены ў ВНУ ззаду; ззаду і вясёлыя дні на бульбе. Радасныя і шчаслівыя, мы называем сябе студэнтамі. Такім чынам, «праграма-мінімум» — паступіць — выканана. Але ў кожнага з нас ёсць канчатковая мэта. Думаю, што мая «праграма-максімум» не адрозніваецца ад многіх іншых — выдатна вучыцца і стаць добрым спецыялістам.

А далей... Кожны з нас, мусіць, марыць стаць вучоным. Мая мара — прысвяціць сябе навуцы, даследаванню біяхімічных працэсаў на малекулярным узроўні. Але ў канчатковым выніку не так важна, кім быць: настаўнікам, інжынерам ці доктарам навук. Галоўнае для мяне — быць карыснай людзям. Няхай доля маёй працы будзе кропляй, але кропляй важкай і патрэбнай.

Адказаць на пытанне, ці адчуваю я сябе поўнасцю падрыхтаванай да вучобы ў БДУ, адразу, мабыць, цяжка. Найлепшы адказ дадуць вынікі сесіі.

Цяпер часта ўспамінаю сваіх настаўнікаў. Гэта дзякуючы ім усе мае аднакласнікі сталі студэнтамі.

А наперадзе пакуль што— экзамены. Трэба сур'ёзна займацца. І няхай не будзе правільнай прымаўка, што «студэнт жыве ад сесіі да сесіі». Ва ўсякім выпадку не будзем да гэтага прывыкаць.

**Т. АКСЁНАВА,**
**студэнтка хімфака.**

# СТАРОНКІ СЛАВЫ БАЯВОЙ

## МІНСК — ГОРАД-ГЕРОЙ



**Раздзел «Старонкі славы баявой» вядзе ст. выкладчык кафедры гісторыі СССР гістарычнага факультэта Л. А. Міхайлоўскі.**

З першых жа дзён уварвання ў нашу краіну нямецка-фашысцкія захопнікі сутыкнуліся з масавым супраціўленнем савецкіх людзей, якое прымала самыя разнастайныя формы. Хутка гэта супраціўленне вылілася ў адкрытую ўзброеную барацьбу з ворагам.

У канцы жніўня 1941 года фашысцкія войскі акупіравалі тэрыторыю БССР. Камуністычная партыя Беларусі сваю асноўную ўвагу сканцэнтравала на арганізацыі і развіцці ў тыле ворага ўсенароднай барацьбы супраць іншаземных захопнікаў.

Характарызуючы фашысцкі рэжым у Мінску, падпольная камуністычная газета «Звязда» пісала: «Горад Мінск — цэнтр культуры і навукі беларускага народа—ператворан нямецкімі акупантамі ў засценак смерці і катаванняў. Нямецкія варвары апаганілі нашу сталіцу, знішчылі ўсе каштоўнасці. Пуста і панура ў горадзе. Над горадам вісіць жудасная фашысцкая ноч».

Гітлераўцы разбурылі Беларускі дзяржаўны універсітэт разам з заалагічным, геолага - мінералагічным і гісторыка-археалагічным музеямі; разбурылі медыцынскі інстытут з усімі яго клінікамі; разграмілі АН БССР з 9 інстытутамі, заалагічным і геалагічным музеямі, батанічным садам; знішчылі політэхнічны інстытут, у якім навучалася каля 9 тысяч студэнтаў; разбурылі дзяржаўную філармонію і кансерваторыю. Лепшыя ўцалелыя будынкі горада былі заняты пад фашысцкія ўстановы і арганізацыі.

У адпаведнасці са сваімі планамі немцы праводзілі ў Мінску сістэматычнае знішчэнне савецкіх ваеннапалонных і мірнага насельніцтва. Сродкі знішчэння былі самыя разнастайныя: стварэнне галоднага рэжыму ў лагерах пры знясільваючай працы, стварэнне антысанітарных умоў, якія выклікалі інфекцыйныя захворванні, збіванне і расстрэлы.

Часта раніцай можна было бачыць на вуліцах трупы людзей, расстраляных за ноч. На дзвярах кожнага дома вывешваліся спісы жыхароў гэтага дома. Калі фашысты пры вобыску ў начную пару знаходзілі ў доме чалавека, які не знаходзіўся ў спісе, то яны расстрэльвалі не толькі гэтага чалавека, але і ўладальніка кватэры. Выходзіць і ўваходзіць у горад можна было толькі ў строга ўстаноўлены час, маючы пры гэтым адпаведны дакумент і пропуск. Ідучы па тратуары, трэба было ўступаць дарогу кожнаму немцу і здымаць перад ім шапку.

Акупанты ўвялі для гараджан непасільныя налогі, усемагчымыя паборы, прымусовую працу. Пад пагрозай зброі яны прымушалі савецкіх грамадзян працаваць на прадпрыемствах, якія абслугоўвалі патрэбы нямецкай арміі.

Але тэрор і насілле гітлераўскіх захопнікаў не зламалі волі беларускага народа, які з першых дзён Айчыннай вайны ўзняўся на свяшчэнную барацьбу супраць фашысцкіх акупантаў. Любоў да Савецкай Айчыны і нянавісць да яе ворагаў, імкненне адстаяць сваю свабоду, незалежнасць, сваю сацыялістычную дзяржаву паднімалі народныя масы на барацьбу супраць фашыстаў і іх «новага парадку». Супраціўленне захопнікам насіла самы разнастайны характар, пачынаючы ад невыканання іх распараджэнняў і заканчваючы ўзброенай барацьбой савецкіх патрыётаў. Гэта была сапраўды ўсенародная барацьба ў тыле ворага.

...У жніўні 1941 года на кватэры ў А. В. Каліноўскага сабраліся камуністы-падпольшчыкі І. М. Цімчук, А. В. Каліноўскі, С. І. Зайцаў, В. Амельянюк і С. Амельянюк (бацька і сын). На гэтай нарадзе было вырашана разгарнуць у горадзе падпольную антыфашысцкую работу: збіраць зброю і боепрыпасы для арганізоўваемых за горадам партызанскіх груп і атрадаў, ствараць у горадзе дыверсійныя групы для барацьбы з ворагам.

Усе гэтыя групы спачатку дзейнічалі самастойна, але абстаноўка і стаячыя перад падпольшчыкамі задачы патрабавалі стварэння аб'ядноўваючага агульнагарадскога цэнтра, які ўзначаліў бы падполле і накіроўваў яго работу. У канцы лістапада — пачатку снежня 1941 года па ініцыятыве І. П. Казінца на адной з канспіратыўных кватэр у Кастрычніцкім раёне горада была праведзена нарада прадстаўнікоў некаторых падпольных груп. На нарадзе быў створан часовы «дадатковы» кіруючы орган (даппартком), так як падпольшчыкі лічылі, што ў Мінску дзейнічае строга законспіраваны падпольны гарком партыі, з якім ніводнай групе не ўдалося пакуль звязацца.

Але ў сапраўднасці ў пачатку вайны ў Мінску такога падпольнага гаркома не было. Таму пазней даппартком быў перайменаван у гарадскі партыйны камітэт (ГПК). Мінская падпольная арганізацыя, якая дзейнічала пад кіраўніцтвам гарадскога партыйнага камітэта, будавалася па прынцыпу звенняў (дзесяткаў). Дзесяткі ствараліся на аснове асабістага знаёмства і рэкамендацый. Звенні ўзначальваліся сакратарамі, якія падтрымлівалі сувязь з камітэтам толькі праз яго прадстаўнікоў ці яго ўпаўнаважаных. Кожны прадстаўнік камітэта накіроўваў работу некалькіх звенняў. Члены звенняў арганізавалі камсамольскія групы. Да пачатку 1942 года было створана 12 партыйных звенняў і 6 камсамольскіх груп. Паступова ГПК наладжваў сувязі з іншымі падпольнымі групамі і арганізацыямі, якія дзейнічалі ў Мінску, і хутка стаў кіруючым цэнтрам барацьбы працоўных супраць гітлераўскіх акупантаў.

У цесным кантакце з гарадскім партыйным камітэтам у Мінску працавала падпольная арганізацыя, якая ўзнікла ў верасні 1941 года і называлася Ваенны савет партызанскага руху (ВСРП). У яе ўваходзілі пераважна байцы, камандзіры і палітработнікі Савецкай Арміі, якія трапілі ў акружэнне ці ўцяклі з фашысцкага палону. На чале стаяў І. І. Рогаў.

З першых жа дзён акупацыі савецкія патрыёты ў Мінску арганізавалі ў многіх месцах нелегальнае слуханне маскоўскіх радыёперадач, прыём, размнажэнне ад рукі, на пішучых машынках зводак Інфармбюро, якія раскідваліся і расклейваліся па горадзе, перадаваліся з рук у рукі. Вялася і вусная агітацыя супраць акупантаў.

З утварэннем агульнагарадскога падпольнага партыйнага цэнтра масава-палітычная работа ў падполлі прыняла яшчэ больш шырокі размах.

Самым распаўсюджаным відам падрыўной работы быў сабатаж на прадпрыемствах, які насіў масавы характар. Рабочыя выводзілі са строю абсталяванне, ламалі інструменты, давалі бракаваную прадукцыю, выносілі гатовыя вырабы ці прыводзілі іх у няспраўнасць.

Членамі падпольнай групы А. А. Маркевіча была выведзена са строю партыя выраблены на радыёзаводзе радыёпрыёмнікаў, на заводзе «Кастрычніцкай рэвалюцыі» быў узарван адрамантаваны танк, спалена 360 бочак бензіну.

Рабочыя лесапільнага завода В. А. Філімонаў і яго таварышы дзесяткі разоў выводзілі са строю пілараму і спалілі дзевяць матораў.

У справаздачы немцаў за верасень месяц 1941 года гаворыцца: «Удалося арыштаваць былога палітрука, які займаўся на адной з фабрык у горадзе Мінску шкодніцкай работай. Ён быў расстралян».

На фабрыцы «Кастрычнік» рабочыя сістэматычна псавалі адзенне, якое выраблялася для акупантаў. На фабрыцы імя Крупскай быў спален вялікі склад з парашутамі. Каля парка імя Чэлюскінцаў знішчаны два склады з абмундзіраваннем. Двойчы падпальвалася войлачная фабрыка, поўнасцю быў спален лесазавод.

Падпольная група члена партыі А. А. Маркевіча ўжо ў снежні 1941 года наладзіла рэгулярны выпуск лістовак, а з 1942 года — падпольнай газеты «Патрыёт Радзімы».

У пачатку 1942 года пры актыўным удзеле Казінца, Нікіфарава, Амельянюка была створана падпольная друкарня па вуліцы Астроўскага. У гэтай друкарні быў наладжан выпуск перыядычнага лістка «Веснік Радзімы».

# СВЯТКУЕ ГІСТФАК

40 год гістарычнаму факультэту... За гэтыя гады з яго сцен выйшла больш трох з паловай тысяч настаўнікаў, філосафаў, сацыёлагаў, добрых спецыялістаў.

На свята — урачысты вечар, прысвечаны юбілею факультэта, — прыйшлі прадстаўнікі амаль усіх выпускаў, пачынаючы з 1939 года.

Першы выпуск, другі... Трэцяга не было. Студэнты разам з выкладчыкамі сталі ў адзін строй, каб абараніць Радзіму ад фашысцкіх захопнікаў. Іх імёны зараз золатам напісаны на Дошцы славы факультэта.

Аб слаўнай гісторыі юбіляра, аб людзях, якія выйшлі з яго сцен, расказаў шматлікай аўдыторыі член - карэспандэнт АН СССР, доктар гістарычных навук, прафесар Л. С. Абецэдарскі.

Прарэктар БДУ У. С. Багданаў зачытаў спіс выкладчыкаў, якія ўзнагароджаны ганаровымі граматамі. З прывітальным словам звярнуліся да прысутных дырэктар інстытута гісторыі партыі пры АН БССР І. М. Ігнаценка, намеснік архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР В. А. Жанала. З цёплымі сяброўскімі пажаданнямі выступілі прадстаўнікі Мінскага педінстытута, хімічнага і фізічнага факультэтаў, камсамольскай арганізацыі падрыхтоўчага факультэта універсітэта.

А потым прагучаў святочны канцэрт. Іскрамётныя танцы «Крыжачка» перамяжоўваліся з задумлівай «Лунной сонатой» Бетховена, вершамі Друнінай, Еўтушэнкі. Бурнымі апладысментамі сустрэлі гледачы выступленне студэнтаў з Афганістана і Алжыра. Прагучалі са сцэны і музычныя прывітанні сяброў — філолагаў, журналістаў, географаў.

Вечар прайшоў у тым святочным прыўзнятым настроі, які бывае толькі ў вялікія святы. Гэта і было вялікае свята, свята не толькі факультэта, але і ўсяго універсітэта.

**Л. НІКУЛІНА.**



**Таццяна ХАЛОПІЦА, Наталля САМОЙЛАВА і Галіна ТАТАРЭВІЧ — пяцікурсніцы ФПМ. Зараз яны асвойваюць ЭВМ «Мінск-32» у вылічальным цэнтры БДУ.**

**Фота А. ЦЫГУЛЁВА.**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

Вячаслаў РАГОЙША

# ВЫШЫНЯ

— Добры дзень, мае дарагія сябры! Сядайце!

Пачынаецца звычайны ўрок англійскай мовы—як і дзень, год, дзесяць гадоў таму назад. Звычайны? Не зусім. Бо на гэтым уроку, апрача Філалогіі, будзе прысутнічаць і Паэзія—у густоўным цытаванні ўзораў англійскай літаратуры на мове арыгінала, у захопленым вытлумачэнні найтанчэйшых нюансаў свайго і чужога слова.

На спецсемінары па мастацкаму перакладу, якім Язэп Семяжон вось ужо каторы год кіруе на тым жа філалагічным факультэце універсітэта, — свой прадмет, свая спецыфіка выкладання. Аднак і тут зноў тая самая Паэзія—у натхнёным паглядзе, жэстах выкладчыка, сутнасці і характары ягонай лекцыі.



А вось Язэп Семяжон, прадстаўнік Беларусі, на трыбуне ўсесаюзнай нарады па пытаннях перакладу. Узнёсла і пераканаўча гаворыць ён пра многа разоў передуманае, асноўнае, на яго думку, у працы дойліда «мастоў дружбы».

Асобныя перакладчыцкія прынцыпы, якімі карыстаецца і якія развівае Язэп Семяжон, кладуцца адзін да аднаго, як бёрны ў добрым зрубе, дапамагаючы ўзводзіць надзейны і прасторны будынак усёй эстэтычнай сістэмы савецкага рэалістычнага перакладу. Аснова, падваліны гэтага будынка—глыбокае, умелае валоданне матэрыялам і інструментам кожнага пісьменніка—родным словам. Кожны, хто пісаў пра Язэпа Семяжона, абавязкова адзначаў яго незвычайнае чуццё слова, дасканалае веданне не толькі беларускай літаратурнай мовы, але і разнастайных яе гістарычных, дыялектычных, іншых вузкаўжывальных пластоў.

Сёння ў перакладах Я. Семяжона гучыць паэзія розных часоў, розных народаў. Яго пераклады, нават пісьменнікаў самых аддаленых эпох, самых далёкіх ад Беларусі па месцу жыхарства, — не рэлікты, не экзатычныя дзіўноты, а творы, глыбока сучасныя па духу, праблемах, пафасу. Яны, пры ўсіх зразумелых «папраўках» на стыль аўтара, краіны і часу, гучаць лёгка, нявымушана, іскрацца дыяментамі сакаўнога беларускага маўлення. За ўсім тым стаіць яркая творчая асоба перакладчыка. У Семяжона можна вучыцца творчай мэтанакіраванасці, цэласнасці эстэтычных поглядаў, майстэрству, мове—як у кожнага сапраўднага арыгінальнага паэта. Зрэшты, перакладчык Бёрнса і Гусоўскага і ёсць сапраўдны паэт. Пачаўшы ўласную творчасць з арыгінальных вершаў, ён пазней пераключыў свой духоўны вопыт, талент на суседнюю галіну мастацкай дзейнасці і ўвесь час, сілы і веды пачаў аддаваць навядзенню трывалых мастоў дружбы паміж беларускім і іншымі народамі. З вышыні пражытых гадоў асабліва добра відаць, што выбар быў правільны і своечасовы. Язэп Семяжон заняў у беларускай літаратуры месца поплеч з найбольш віднымі паэтамі нашых дзён.

* * *

*За заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і ў сувязі з 60-годдзем пісьменнік Язэп Семяжон (Іосіф Ігнатавіч Сяміжонаў) узнагароджан ордэнам Дружбы народаў.*

# ПАЛАЖЭННЕ

## АБ ПРАВЯДЗЕННІ АГЛЯДУ-КОНКУРСУ АГІТАЦЫЙНА-МАСТАЦКІХ БРЫГАД БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА.

**Агляд-конкурс агітацыйна-мастацкіх брыгад універсітэта адбудзецца 15—20 снежня 1974 года. Мэта агляду-конкурсу — далейшае ўмацаванне і развіццё агітбрыгад, павышэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню іх рэпертуару і выканаўчага майстэрства, умацаванне сувязей агітбрыгад з жыццём, узмацненне іх ролі ў камуністычным выхаванні працоўных.**

**Максімальны састаў агітбрыгады — 17 чалавек, агіттэатра — 25 чалавек.**

**У выступленні агітбрыгады неабходна выкарыстоўваць мастацкае слова, вакальныя, музычныя, харэаграфічныя і іншыя жанры.**

**Працягласць выступлення агітбрыгады не павінна перавышаць 45 мінут, агіттэатра — адной гадзіны. У праграме можна выкарыстоўваць усе даступныя тэхнічныя сродкі (кіно, дыяпраектары, фільмаскопы, магнітафоны і інш.).**

**Кіраўнікі факультэцкіх агітбрыгад прадстаўляюць у праўленне студэнцкага клуба універсітэта не пазней 8 снежня 1974 года спіс удзельнікаў агітбрыгады і праграму выступлення ў пяці экземплярах. Журы ацэньвае выступленне кожнай агітбрыгады па наступных паказчыках:**

**выкананне патрабаванняў палажэння агляду-конкурсу;**
**актуальнасць і грамадская значнасць рэпертуару;**
**выканаўчае майстэрства;**
**музычнае суправаджэнне;**
**рытмічнасць;**
**кампазіцыйнае рашэнне праграмы.**

**Пераможца вызначаецца па найбольшай суме набраных ачкоў.**

**Агітбрыгада, якая зойме І месца, узнагароджваецца паездкай у г. Брэст.**

**Лепшыя выканаўцы — бясплатнай турысцкай пуцёўкай у час зімовых канікулаў. Калектывам-пераможцам будуць уручаны граматы.**

**Журы конкурсу:**

**А. М. ОЗЕРАЎ, заслужаны артыст Латвійскай ССР, — старшыня.**

**Т. Д. АРЛОВА — намеснік.**

**В. А. ЗАХАРАВА, Ю. С. ШЫНКАР, Я. В. СКВАРЧЭЎСКІ, Н. П. ХРЫПКО, В. І. ГІРЭНКА, Л. П. ЧАРАНКОВА, А. Т. ФЕДАРУК — члены журы.**

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ**
**ПРАЎЛЕННЕ КЛУБА БДУ.**

# А. А. БІРАЛА

22 лістапада 1974 года заўчасна памёр таленавіты беларускі вучоны і педагог, дацэнт кафедры гісторыі філасофіі і логікі, кандыдат філасофскіх навук, член КПСС з 1962 года Альберт Афанасьевіч Бірала.

А. А. Бірала нарадзіўся 16 ліпеня 1932 года ў г. Чэрвені Мінскай вобласці. У 1949 годзе ён паступіў на аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта БДУ. Са снежня 1955 года па 1958 год навучаўся ў аспірантуры інстытута філасофіі і права АН БССР. У чэрвені 1959 года паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю.

З ліпеня 1960 года Альберт Афанасьевіч працуе старшым навуковым супрацоўнікам інстытута філасофіі і права АН БССР, з 1962 года — старшым выкладчыкам кафедры гісторыі філасофіі і логікі БДУ.

А. А. Бірала быў таленавітым даследчыкам беларускай і замежнай філасофіі. Ім апублікавана больш 40 навуковых работ па розных праблемах гісторыка - філасофскай навукі. Сярод іх вядомая манаграфія «Філасофская і грамадская думка ў Беларусі і Літве ў канцы XVII — сярэдзіне XVIII стагоддзя» — першая ў савецкай гісторыка - філасофскай літаратуры па гэтай тэме.

А. А. Бірала—сааўтар такіх вядомых прац савецкіх вучоных, як «Гісторыя філасофіі ў СССР», «Вялікая Савецкая Энцыклапедыя, Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, «Нарысы філасофскай і сацыялагічнай думкі ў Беларусі», атрымаўшых прызнанне савецкай грамадскасці.

Навуковыя працы А. А. Біралы вызначаюцца тэарэтычнай глыбінёй, дакладнасцю марксісцка-ленінскіх пазіцый, яснасцю і даходлівасцю выкладання, цудоўным літаратурным стылем. Альберт Афанасьевіч умела спалучаў даследчую працу з вялікай плённай працай педагога, быў таленавітым выхавацелем моладзі. Ён за сваё кароткае жыццё падрыхтаваў нямала высокакваліфікаваных філосафаў-марксістаў.

А. А. Бірала быў прынцыповым, сціплым, карыстаўся аўтарытэтам сярод выкладчыкаў і студэнтаў.

Ва ўсіх, з кім сустракаўся Альберт Афанасьевіч, ён здабываў шчырую павагу і любоў сваёй навуковай эрудыцыяй, прастатой.

Светлая памяць аб Альберце Афанасьевічу Бірале, чулым педагогу і цудоўным чалавеку, захаваецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

## НА ФІЛФАКУ

# СПРАБУЕМ СІЛЫ НА ЎЗЛЁТ

Тых, хто марыць у будучым асядлаць крылатага Пегаса, аб'ява аб чарговым пасяджэнні літаратурнага аб'яднання «Узлёт» усхвалявала. Вельмі хацелася і ў той жа час было боязна прадставіць на суд таварышаў усё, што вынашана ў сэрцы і цяпер роўнымі радкамі ляжыць на паперы.

Вечарам 19 лістапада кабінет беларускай літаратуры філфака выглядаў прыцішана святочным. Знаёмствам з новымі ўзлётаўцамі і пачалося пасяджэнне. Будучыя паэты і празаікі расказвалі свае, яшчэ кароценькія біяграфіі, з цеплынёй называлі імёны любімых паэтаў, чыталі свае вершы. Знікла напружанасць, якая панавала спачатку. Гэтаму, мабыць, садзейнічала атмасфера адкрытага і шчырага выказвання думак, якую змаглі стварыць з першых хвілін кіраўнікі аб'яднання паэты Алег Антонавіч Лойка і Рыгор Міхайлавіч Семашкевіч.

Затым з крытычным аглядам твораў сваіх сяброў выступіў першакурснік Ігар Жук. Было відаць, што ён творча і старанна рыхтаваўся да выступлення, выказваў свае думкі наконт вершаў. Даклад зацікавіў прысутных, калі меркаваць па выступленнях старэйшых удзельнікаў «Узлёту» Івана Ягоўдзіка, Міколы Мятліцкага.

Закончылася пасяджэнне выступленнем А. А. Лойкі. Ён умела, каб не пакрыўдзіць аўтараў, указаў на недахопы, параіў, чым кіравацца пры выбары тэмы.

Такая сяброўская размова натхніла пачынаючых на творчы пошук свайго месца ў вялікім таямнічым свеце, імя якому Паэзія.

**М. БУРЭНКА.**

АГЛЯД ДРУКУ

# НЕАДПАВЕДНЫМ СЛОВАМ

Факультэцкая газета — гэта своеасаблівa сканцэнтраваная думка ўсяго факультэта, калектыву. Праз яе можна гаварыць з усімі, прасіць парады і дапамагаць, хваліць і крытыкаваць. Ці не так?

Вось мінулы нумар насценгазеты юрыдычнага факультэта «Савецкі юрыст».

Адразу ўражвае яркае мастацкае афармленне. Праўда, чытач будзе ў цяжкім становішчы, калі паспрабуе прачытаць загалоўкі матэрыялаў: словы ў іх напісаны рознымі фарбамі, ды яшчэ раскіданы па кутках матэрыялаў.

Але знешні выгляд — гэта, згодзімся, не галоўнае. Разгледзім змест матэрыялаў.

«Чарнаград». Так назвалі студэнты другога курса трэцяй групы вёску, дзе працавалі, а хутчэй, сумавалі па Мінску. Пануе адзін матыў—нылі плечы, было цяжка, усё ўсім надакучыла. Няўжо сапраўды ўсім? Дзе ж словы пра поспехі, цікавыя мерапрыемствы?

У такім жа тоне і другі матэрыял, які апавядае аб рабоце студэнцкага атрада ў Малдавіі. Аўтар многа філасофствуе, разважае пра ўзаемаадносіны людзей, але пэўнага расказу аб жыцці, працы членаў атрада не атрымалася.

Толькі трэці матэрыял (аўтар Н. Гарабуць) даволі жыва і цікава знаёміць з працоўнымі буднямі, поспехамі другакурснікаў, якія, нягледзячы на цяжкасці, дабіліся добрых вынікаў. Настрою матэрыялу поўнасцю адпавядае назва — «Малайцы!».

Вось такіх бы артыкулаў больш на газетную паласу. Газета павінна «бачыць» свайго чытача і прадстаўляць на яго суд цікавыя, высокамастацкія матэрыялы.

**А. ШЫНКЕВІЧ.**

СПОРТ

# Х АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАЯ

Падвяла вынікі спартыўнай работы Х агульнаўніверсітэцкая справаздачна - выбарная канферэнцыя спортклуба БДУ. В. П. Шапялевіч, старшыня праўлення, у сваім дакладзе расказаў аб дзейнасці клуба за перыяд 1973 — 1974 года, ахарактарызаваў работу факультэта па здачы норм ГПА, па правядзенню універсітэцкай спартакіяды і аглядаў-конкурсаў.

І месца ў ХХІІ спартакіядзе мінулага навучальнага года заняў спартыўны калектыў фізічнага факультэта, на ІІ — гістфак, на ІІІ — ФПМ. Старшыня назваў і пераможцаў у аглядзе-конкурсе БДУ. Імі сталі ФПМ, біялагічны і фізічны факультэты.

На канферэнцыі выступілі таксама В. Голубеў, старшыня спортбюро біяфака, П. Герасімовіч, старшыня спортбюро ФПМ, У. Александроўскі, член турклуба, М. Прахараў, старшыня спортбюро фізфака, Э. Зыранаў, старшыня аблсавета ДСТ «Буравеснік».

Адбыліся выбары новага саставу праўлення, былі вылучаны 22 дэлегаты на абласную канферэнцыю ДСТ «Буравеснік». Спартыўны калектыў БДУ прыняў павышаныя абавязацельствы на 1975 год па падрыхтоўцы спартсменаў - разраднікаў і грамадскіх кадраў.

У заключэнне быў дадзен канцэрт мастацкай самадзейнасці.

**Наш кар.**

## ХРОНІКА

Пачалося занальнае першынство мужчынскіх і жаночых каманд па валейболу і баскетболу ВНУ рэспублікі.

Сёння жаночая каманда баскетбалістак нашага універсітэта сустракаецца са спартсменкамі РТІ.

1—2 снежня пачнецца першынство універсітэта па класічнай і вольнай барацьбе.

Спортбюро гістфака праводзіць першынство факультэта па футболу на прыз «Залатая восень». Удзельнічаюць зборныя каманды курсаў.








ВОСЬ ЯКАЯ ЯНА, ГІМНАСТЫКА!

Фота В. Драчова.

ЯК НЕ ТРЭБА СЯБЕ ПАВОДЗІЦЬ

# АБ КУЛЬТУРЫ МОВЫ

Можа здарыцца, што з вамі загаворыць чалавек, да якога вы адносіцеся непрыязна. Не трэба ігнараваць яго ў прысутнасці іншых людзей, дэманстратыўна паварочвацца спіной. Вашы адказы чалавеку, які вам непрыемны, павінны быць стрыманымі і фармальна няўразлівымі.

Бывае і так, што давodзіцца сутыкацца з грубасцю. У такіх выпадках належыць, канешне, дзейнічаць у адпаведнасці з абставінамі, але ні ў якім разе не трэба ўступаць у сварку, абражаць у адказ на зняваrу. Лепшым спосабам адносін да грубасці з'яўляецца трапны адказ—агульны смех адразу ж ставіць усё на свае месцы.

Нельга ніколі забываць, што культура мовы — першая прыкмета інтэлігентнасці чалавека. Жаргонныя слоўцы, грубыя звароты, безапеляцыйнасць меркаванняў — усё гэта толькі дэманструе адсутнасць правільнага выхавання.

Не ўжывайце словы-паразіты накшталт «дык вось», «так сказаць», «значыць» і г. д.

Не трэба таксама ўпадаць у іншую крайнасць— выказвацца залішне мудрагеліста, з вялікай колькасцю замежных слоў, падкрэсліваючы сваю «адукаванасць».

У час размовы ні словы, ні фразы не варта вымаўляць занадта гучна. Але непрыстойна вымаўляць іх і вельмі ціха. Па-першае, вас могуць не пачуць, а, па-другое, могуць падумаць, што вы хочаце паведаміць субяседніку нешта сакрэтнае, а гэта можа быць зразумета як намёк на тое, што астатнія вам замінаюць.

Гаварыць старайцеся выразна, не спяшаючыся.

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА**

«Белорусский университет» —орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ем — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Тыраж 2000 экз. АТ 05655 Заказ № 1570